# Школьная планета

***НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!***

***№ 9 II чвэрць 2017/2018навуч. года***

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно” Мінскай вобласці*

# Фінансавая граматнасць




## СПЕЦЫЯЛЬНЫ ПРАЕКТ

## ***ФІНАНСАВАЯ АЗБУКА***

**БАНК** - гэта месца, дзе людзі могуць здзяйсняць розныя аперацыі з грашыма. Напрыклад, прыносіць грошы, каб пакласці іх ва ўклад, ці наадварот, узяць грошы ў крэдыт. Або прынесці грошы, каб банк іх пераправіў у іншы горад іншаму чалавеку (зрабіў грашовы пераклад).

**БЕЗНАЯЎНЫЯ ГРОШЫ** - гэта грошы, якія знаходзяцца ў банку на разліковым рахунку або карт-рахунку. Сама назва «без-на-яўныя» кажа пра тое, што гэта не наяўныя грошы. Распараджацца імі можна рознымі спосабамі. Можна прыходзіць у банк і даваць пісьмовыя ўказанні, каб нешта купіць, а можна кіраваць гэтымі грашыма праз банкаўскую аплатную картку. Да прыкладу, прыходзіць у краму і расплачвацца карткай. Безнаяўныя грошы можна нават перавесці ў наяўныя - дастаткова прыйсці ў банк і, прад'явіўшы свой пашпарт, папрасіць выдаць грошы на рукі.



*Дом, у якім утульна ўсім!*
**berezino2.school.by vk.com/club59543714 *№ 9, II чвэрць 2017/2018 нав. года***

# АДКУЛЬ З'ЯВІЛАСЯ СЛОВА "ГРОШ"?




Грош - назва манеты. Слова гэта, як і тыя манеты, якія яно азначала, перажыло доўгую і заблытаную гісторыю. Вы ўпэўнены, напрыклад (ды і наша прымаўка гэта пацвярджае), што грош - вельмі дробная манета. Але ж слова "грош" - гэта нямецкае "гросс": вялікі, утворанае ад лацінскага "гроссус дэнарыус" – "цяжкая манета".

Так у Заходняй Еўропе доўга і называлі залатыя і срэбраныя манеты большай, чым звычайна, велічыні.

І на Русі першапачатковае слова "грош" прымянялася да розных манет - у дзве капейкі і г. д. Але ўжо гадоў сто таму яно стала азначаць паўкапейкі (пасля 1815 года); словы "ні граша" і "ані шэлега" зліліся і прынялі значэнне: "нават ні драбнюткага грошыка".

Разабраўшыся ў гісторыі гэтага словазлучэння, можна цвёрда сказаць: яно не вельмі старажытнае; у дні дапятроўскія, калі грош быў роўны дзвюм капейкам, сказаць: "ні граша няма" - зусім не значыла "нічога няма".

Двухкапеечны грош быў зусім не такой ужо дробяззю; на яго можна было сяк-так дзень пражыць. Бо не гаворым жа мы цяпер, жадаючы апісаць поўную адсутнасць грошай: "у мяне ні рубля няма"; кажам: "ні капейкі", бо гэта - самая дробная манета.




Не старэйшыя за 100 - 150 год, пэўна, і іншыя прыказкі і прымаўкі, звязаныя са словам "грош": "Не было ні граша, ды раптам алтын" (гэта значыць тры капейкі), "Ламанага граша даць нельга" , "Толку ні на грош".



Однажды Сократа спросили: «Что является для человека наиболее ценным и важным в жизни — богатство или слава?» Великий мудрец ответил: «Ни богатство, ни слава не делает еще человека счастливым. Здоровый нищий счастливее больного короля!»

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 9, II чвэрць 2017/2018 нав. года

# ЭКОНОМИЧЕСКИЕ ЗАГАДКИ

| | | |
|---|---|---|
| *В наши дни не встретишь эту<br>Очень малую монету.<br>В сказках ты её найдёшь,<br>Денежка зовётся…*<br><br><br>*ГРОШ* | *Чтобы партнёров не мучили споры,<br>Пишут юристы для них…*<br><br>*ДОГОВОРЫ* | *Коль трудился круглый год,<br>Будет кругленьким…*<br><br>*ДОХОД* |
| *Чтобы дом купить я смог,<br>Взял кредит, внеся…*<br><br>*ЗАЛОГ* | *И врачу, и акробату<br>Выдают за труд…*<br><br>*ЗАРПЛАТУ* | *Чуть оплошаешь — так в том же момент<br>Рынок захватит весь твой…*<br><br><br>*КОНКУРЕНТ* |
| *Приносить доходы стал<br>В банке папин…*<br><br>*КАПИТАЛ* | *За сметану, хлеб и сыр<br>В кассе чек пробьёт…*<br><br>*КАССИР* | *На рубль — копейки, на доллары — центы,<br>Бегут-набегают в банке…*<br><br>*ПРОЦЕНТЫ* |
| *Всё, что в жизни продаётся,<br>Одинаково зовётся:<br>И крупа, и самовар<br>Называются…*<br><br><br>*ТОВАР* | *Мебель купили, одежду, посуду.<br>Брали для этого в банке мы…*<br><br><br>*ССУДУ* | *На товаре быть должна<br>Обязательна…*<br><br><br>*ЦЕНА* |

berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 9, II чвэрць 2017/2018 нав. года

# ЧАМУ ВА ЎСІХ КРАІНАХ РОЗНЫЯ ГРОШЫ?

**СЛОВА «ВАЛЮТА» ПРЫДУМАЛІ Ў ДАЛЁКІЯ ЧАСЫ Ў СОНЕЧНАЙ ІТАЛІІ. ДАСЛОЎНА ЯНО ПЕРАКЛАДАЕЦЦА ЯК «КОШТ».**




**ВАЛЮТЫ БЫВАЮЦЬ НАЦЫЯНЫЯ - У НАС ГЭТА БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ. А ВОСЬ ГРОШЫ ІНШЫХ КРАІН НАЗЫВАЮЦЦА ЗАМЕЖНЫМІ ВАЛЮТАМІ.**

- ✓ Паколькі ў кожнай краіны свае грошы, то разлічвацца там чужымі валютамі нельга. Усе цэны на тавары, прадукты, забавы - у мясцовых валютах. Напрыклад, калі мы едзем у Крым, то павінны купіць расійскія рублі. А калі ў Літву - мяняем беларускія рублі на літы. Гэтак жа паступаюць і людзі з іншых краін, калі едуць у Беларусь.
- ✓ Для таго каб купіць замежную валюту, трэба наведаць банк або абменны пункт.У нас у Беларусі для куплі валюты патрэбен пашпарт. Можна адразу купіць валюту той краіны, у якую вы едзеце, а можна купіць універсальныя валюты (напрыклад, еўра або далар), якія выкарыстоўваюць амаль ва ўсіх краінах свету, а пасля прыезду ў другую краіну зноў пайсці ў банк і купіць мясцовыя банкноты.
- ✓ Кошт замежных грошаў вызначаюць цэнтральныя банкі розных краін. Называецца гэта курс: напрыклад, курс беларускага рубля да далара зараз прыкладна 2 рублі. Гэта значыць, за 2 рублі можна купіць адзін долар. Курс валют мяняецца кожны дзень - ён можа як павялічвацца, так і змяншацца. Чым больш людзей (ці прадпрыемстваў для сваёй работы) хочуць купіць нейкую пэўную валюту, тым больш яна каштуе.



# Самыя незвычайныя грошы

Прынятыя ў сучасным грамадстве грошы - гэта не заўсёды манеты і банкноты. Многія народы да гэтага часу выкарыстоўваюць у якасці валюты драўляныя дошчачкі або металічныя пласцінкі.

**Даніна футбалісту.** У 2006 годзе нацыянальным банкам Ірландыі была выпушчана банкнота вартасцю ў 5 фунтаў. Выпуск купюр абмежаванай серыі прысвяцілі памяці аднаго з лепшых футбалістаў краіны - Джорджа Беста, які пайшоў з жыцця годам раней. За аснову адбіткаў для друку ўзялі фатаграфіі самых знакамітых яго футбольных пазіцый на полі, калі ён здолеў забіць важныя мячы ў вароты каманды суперніка.







**Райскі водар.** Аднымі з самых унікальных з'яўляюцца манеты з серыі «Райскі водар», выпушчаныя на востраве Палаў. Іх адметная асаблівасць у тым, што кожная мае свой пах. Першай манетай з партыі стала манета з выявай і водарам какоса. На другой манеце выгравіравана серфінгістка на хвалі, і пахне манета марской свежасцю.



**Матылёк з Камеруна.** Сярэбраную манету ў 1000 камерунскіх франкаў выпусцілі ў 2011 годзе. Многімі нумізматамі яна была прызнаная самай прыгожай у свеце - на ёй адлюстравана кветка, на якой сядзіць аб'ёмны матылёк, каляровыя крыльцы якога выступаюць за межы манеты. Тэхналогія яе вырабу трымаецца ў строгім сакрэце. Вядома толькі, што выпушчана такіх было 2500 штук, і практычна ўсе яны адразу былі раскуплены калекцыянерамі.

**Сярэбраная піраміда.** Гэтая арыгінальная манета была выпушчана ў 2009 годзе манетным дваром Pobjoy Mint у англійскім горадзе Тадворт. Яе выпуск прымеркавалі да 70-годдзя з дня смерці археолага Говарда Картэра, які знайшоў грабніцу Тутанхамона ў даліне Каралёў у Егіпце. На манеце трохкутнай формы намаляваны пісьмёны са сцен грабніцы, а ў верхнім куце - сонечны дыск з украпінамі часцінак пяску, узятага з грабніцы фараона.




**Гітары.** У 2004 годзе ў Самалі былі выпушчаны каляровыя манеты з сярэбраным напыленнем. Выраб калекцыйных металічных грошаў прымеркавалі да 50-годдзя з дня зараджэння рок-н-ролу. Яны выкананы ў форме гітар вядомых музыкантаў і некаторых амерыканскіх штатаў. Намінал кожнай манеты складае 1 долар.






**Уральская сава.** У 2007 годзе нацыянальны банк Манголіі пачаў выпускаць калекцыйныя манеты з выявамі жывёл, якія знаходзяцца на мяжы вымірання. Гэтыя металічныя грошы запатрабаваны не толькі ў нумізматаў, але і ў звычайных грамадзян, якія вырашылі падтрымаць ідэю ўрада. На манеце 2011 года з срэбра вышэйшай пробы размешчана Уральская сава з вачыма з цёмных крышталяў Свароўскі.




**Сіксцінская капэла.** На пярэднім баку манет «Сіксцінская капэла», выпушчаных тыражом 999 штук, размешчаны профіль манаха, а на адваротным - вобраз Бога і Адама, сапраўды такі ж, як на карціне вялікага Мікеланджэла.

**Грошы Кіссі.** Кіссі – так называлі скручаныя жалезныя палачкі даўжнёй 30 см аж да пачатку XX стагоддзя ў некаторых краінах і плямёнах Заходняй Афрыкі. Адзін канец у такіх грошах быў у выглядзе літары Т, а другі - у форме лапаткі, і называліся яны кіссі-пені. Для здзяйснення буйной пакупкі іх аб'ядноўвалі ў невялікія звязкі: напрыклад, карова ацэньвалася ў сто вязанак па дваццаць палачак.



# ТВАЕ ПЕРШЫЯ ФІНАНСЫ













## ЧЫТАЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

Чаму грошы розных краін называюцца іменна так, а не інакш?
Адкуль бяруцца грошы і куды яны "знікаюць"?

ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына